Пятніца, 20 Лістапад 2020

Максіму Каржыцкаму прысудзілі 10 сутак арышту – за ўдзел у акцыях памяці Рамана Бандарэнкі

Друкаваць (/news/sud/item/3802-karzhytskamu-prysudzili-10-sutak?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=dc21a73a7170e8daf3e6ba1fd56acc5395b4ff93)

Ацаніць гэты матэрыял (2 галасоў)



(/media/k2/items/cache/37bad00ffb38495bdd9c73b73cd3c0ad_XL.jpg)

Максім Каржыцкі

Віцябляніна Максіма Каржыцкага 20 лістапада пакаралі адміністрацыйным арыштам на 10 сутак за ўдзел у акцыях, прысвечаных памяці забітага Рамана Бандарэнкі, якія прайшлі ў Віцебску 13 і 15 лістапада. Разгляд справы адбыўся ў судзе Першамайскага раёну Віцебску. Рашэнне аб арышце мужчыны прыняла суддзя Вераніка Барысава.

Судовае паседжанне ў справе **Максіма Каржыцкага** праходзіла праз скайп у кабінеце суддзі. Сам Максім ужо трое сутак знаходзіцца за кратамі віцебскага СІЗА, куды яго кінулі пасля затрымання 17 лістапада.

Міліцыя склала на віцяблыніна два пратаколы паводле **ч.3 арт. 23.34 КаАП**. Першы – за ўдзел у «несанкцыянаваным пікетаванні» 13 лістапада каля мемарыялу воінам-інтэрнацыналістам «Боль» у Віцебску. Паводле пратаколу, Максім Каржыцкі знаходзіўся ў ліку грамадзян, якія трымалі ў руках плакаты і партрэты і хацелі ўшанаваць памяць аб забітым Рамане Бандарэнку. Другі пратакол – за актыўны ўдзел у вулічным шэсці 15 лістапада ў Віцебску.

> Сваю віну ва ўдзеле ў незаконным пікетаванні Максім не прызнаў. Заявіў, што гэта наагул не было пікетаваннем. *«Я проста паставіў свечку, каб ушанаваць памяць чалавека, якога забілі»*, – сказаў на судзе Максім Каржыцкі. *«Вы ведалі яго асабіста?»* – запытала суддзя. *«Не, але гэты інцыдэнт мяне вельмі моцна закрануў...»* – адказаў Каржыцкі.

Віну ва ўдзеле ў шэсці 15 лістапада ён прызнаў часткова.

У якасці доказаў вінаватасці віцяблыніна міліцыянты падалі ў суд матэрыялы аператыўных відэаздымак. Максім Каржыцкі не выключыў, што чалавек, на якім факусавалася міліцэйская камера, – быў ён сам.

> Суддзя **Вераніка Барысава** прызнала Максіма Каржыцкага вінаватым у абодвух эпізодах і пастанавіла пакараць яго адміністрацыйным **арыштам на 10 сутак**. На свабоду Каржыцкі выйдзе толькі **27 лістапада (каля 14.30)**.

36-гадовы Максім Каржыцкі працаваў раней акторам драматычнага тэатру імя Якуба Коласа. Ён бацька трохгадовага сына. Пасля 9 жніўня мужчыну ўжо некалькі разоў прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. Яго трымалі да суду пад вартай, а потым штрафавалі. Затрыманне 17 лістапада – трэцяе па ліку.

Зміцер Міраш

Апублікавана ў Суд (/news/sud)
Тэгі: артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП) Максім Каржыцкі (/itemlist/tag/Максім%20Каржыцкі) Вераніка Барысава (/itemlist/tag/Вераніка%20Барысава)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Віцяблянам, якія паклалі дзве ружы на прыступкі УУС, прысудзілі «суткі» і папярэдзілі (/news/sud/item/3800-prysudzili-sutki) Менчука аштрафавалі ў Віцебску на 594 рублі за ўдзел у шэсці. Гэта быў яго 4-ы суд » (/news/sud/item/3804-menchuka-ashtrafavali)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3802-karzhytskamu-prysudzili-10-sutak#startOfPageId3802)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https://t.me/Tamilwebseries)